# ВЯРТАННЕ СІМВАЛА



**У Музеі гісторыі Брэста пачалі экспанаваць арыгінал Брэсцкай Бібліі**

Брэсцкую Біблію — унікальны помнік культуры эпохі Рэнесанса, шэдэўр сусветнага паліграфічнага мастацтва, адзін з сімвалаў Брэста — цяпер усе ахвочыя могуць убачыць у Музеі гісторыі горада. Брэст стаў уладальнікам досыць поўнага выдання самай рэдкай і дарагой кнігі XVI стагоддзя ў верасні мінулага года, калі на ўрачыстым мерапрыемстве з нагоды 1000-годдзя арыгінал шэдэўра кнігадрукавання гораду ўручыў Аляксандр Лукашэнка. Экспанаванне пачалося толькі пасля таго, як артэфакт памясцілі ў адмыслова выпрацаваную вітрыну з клімат-кантролем.

Брэсцкая Біблія з'явілася на свет у 1563 годзе ў мясцовай друкарні дзякуючы грошам берасцейскага старосты, канцлера Вялікага Княства Літоўскага Мікалая Радзівіла Чорнага. Аднак да сярэдзіны XX стагоддзя ў горадзе не засталося ніводнага яе асобніка. Да вяртання фаліянта Брэст ішоў крок за крокам. У 2003 годзе ў фондах Абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага з'явіўся факсімільны экземпляр, адноўлены ў Польшчы. У 2014 годзе «Горькаўка» набыла фрагменты фаліянта — больш за 200 аўтэнтычных старонак. У 2017-м быў усталяваны помнік Брэсцкай Бібліі, а ў 2019-м — прэзентавана факсімільнае выданне, выкананае Нацыянальнай бібліятэкай і кампаніяй «Белнефтестрах».



Аляксандр Рагачук змяшчае Брэсцкую Біблію ў спецыяльную вітрыну

Старшыня гарвыканкама Аляксандр Рагачук на пачатку экспанавання друкаванага сімвала Брэста нагадаў, што ідэя вяртання арыгінала кнігі яшчэ на пачатку 2000-х гадоў была агучана на канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы»:

— Ідэя здавалася амаль фантастычнай. Але гады чатыры таму мы сталі падступаць да гэтай тэмы. Абапіраючыся на актыўных людзей, патрыётаў горада, я зразумеў, што ўвасобіць задумку ў жыццё рэальна. Пытанне аўтэнтычнасці было асноватворным. З рук Кіраўніка дзяржавы мы атрымалі падарунак, каштоўнасць якога яшчэ да канца не ўсведамляем. Гэта ўнікальны артэфакт, якога так не хапала нашаму гораду! Экспанавацца ў музеі Брэсцкая Біблія будзе тры месяцы на год, бо рарытэт патрабуе беражлівага да сябе стаўлення і асаблівых правілаў захоўвання.

Валянціна **Казловіч**